Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

«ЗАХОДНІЯ ВАРОТЫ КРАІНЫ» ВІТАЮЦЬ ПАЗІТЫВАМ 6-7



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

24 СНЕЖНЯ 2024 г. АЎТОРАК № 250 (30384)



## «У гэтых праектах можа знайсціся месца і для Беларусі»

**У нядзелю кіраўнік дзяржавы сустракаўся з Прэзідэнтам Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў, прыляцеў у Мінск увечары. А ўжо ў панядзелак з раніцы — у Палацы Незалежнасці спачатку сустрэча з мэрам Масквы, за ёй — нарада па машынабудаванні.** (Падрабязнасці на стар. 2-3)

## Каштоўнасці, якія нас яднаюць

***Хрысціянам Беларусі, якія святкуюць Раство Хрыстова 25 снежня***

*Дарагія суайчыннікі!*

*Сардэчна віншую вас з Раством Хрыстовым.*

*Гэтае свята ўсяляе ў нашы душы веру ў сілу любові і чалавечнасці. Добрымі справамі і ўчынкамі, нястомным клопатам аб бліжніх мы папаўняем свае духоўныя сілы і далучаемся да вечных ісцін.*

*У такія дні па-асабліваму ўспрымаецца значнасць міру і згоды, шчырасці і ўзаемаразумення. Упэўнены, што шанаванне хрысціянскіх каштоўнасцяў будзе і ў далейшым садзейнічаць умацаванню адзінства на беларускай зямлі.*

*Няхай урачыстасць нараджэння Збаўцы падорыць дабрабыт вашым сем'ям, прынясе цяпло і ўтульнасць у кожны дом.*

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.**



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

26 студзеня 2025
ВЫБАРЫ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

## НАПЕРАДЗЕ — НОВЫ ЭТАП

### Цэнтрвыбаркам зарэгістраваў пяць кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь

**Сярод іх — дзеючы кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка, першы сакратар Цэнтральнага камітэта Камуністычнай партыі Беларусі Сяргей Сыранкоў, старшыня Рэспубліканскай партыі працы і справядлівасці Аляксандр Хіжняк, старшыня Ліберальна-дэмакратычнай партыі Беларусі Алег Гайдукевіч, індывідуальны прадпрымальнік Ганна Канапацкая. Зарэгістраваным кандыдатам у Прэзідэнты, а таксама іх прадстаўнікам уручылі адпаведныя пасведчанні.**

Па выніках праверкі дакладнасці подпісаў у падпісных лістах, на падставе пратаколаў абласных, Мінскай гарадской камісій па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь аб устанаўленні колькасці выбаршчыкаў, якія паставілі подпісы ў падтрымку вылучэння кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, ЦВК Беларусі ўстаноўлена колькасць выбаршчыкаў па Рэспубліцы Беларусь, якія паставілі подпісы ў падтрымку вылучэння кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь.

**За Аляксандра Лукашэнку подпісы паставілі 2 518 145 чалавек,**
**Алега Гайдукевіча — 134 472,**
**Сяргея Сыранкова — 125 577,**
**Ганну Канапацкую — 121 077,**
**Аляксандра Хіжняка — 112 779.**

### 5325 участкаў для галасавання

Як адзначыў падчас пасяджэння ЦВК **старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Ігар КАРПЕНКА,** кампанія па выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь праходзіць у адпаведнасці з тэрмінамі, устаноўленымі заканадаўствам. «Завяршыўся этап вылучэння кандыдатаў у Прэзідэнты, — канстатаваў ён. — Па інфармацыі тэрытарыяльных камісій, збор подпісаў ажыццяўляўся ва ўстаноўленым законам парадку. У ЦВК скаргі не паступалі. Выбаршчыкі звярталіся ў інфармацыйна-даведачны цэнтр Цэнтральнай выбарчай камісіі з пытаннямі аб месцы правядзення пікетаў па зборы подпісаў, дакументах, якія пацвярджаюць паўнамоцтвы членаў ініцыятыўных груп, аб магчымасці паставіць подпіс пры прад'яўленні іншага, акрамя пашпарта або ідэнтыфікацыйнай карты, дакумента». СТАР. 5

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

У НОВЫ ГОД – З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ

Ідзе падпіска на I квартал і I паўгоддзе 2025 года.

Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2025 года, у падарунак календары: насценны, рэлігійны, народны і месяцовы.



## «Нам ёсць аб чым пагаварыць»

**Заключнай падзеяй у насычаным графіку Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі на Блізкім Усходзе стала сустрэча ў нядзелю з Прэзідэнтам Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў Мухамедам бен Заідам аль-Нахаянам**

«Я вельмі шчаслівы, што ў нас атрымалася сустрэцца», — вітаў Прэзідэнт ААЭ свайго беларускага калегу. Асноўная частка сустрэчы праходзіла без прысутнасці СМІ, прадстаўнікі якіх змаглі зняць толькі некалькі пратакольных кадраў. Такія мясцовыя традыцыі.

Аляксандр Лукашэнка расказаў, у прыватнасці, аб праведзенай у ААЭ сустрэчы з міністрам інвестыцый ААЭ, выканаўчым дырэктарам інвестыцыйнага фонду ADQ Махамедам Хасанам Аль-Сувейдзі.

> «Мяне міністр акунуў сур'ёзна ў штучны інтэлект. Шмат новага даведаўся. Будзем разам думаць, як нам знайсці агульныя падыходы», — адзначыў ён. Кіраўнік беларускай дзяржавы таксама згадаў аб сваім рабочым візіце ў Аман, які адбыўся да прылёту ў ААЭ. «Мы былі ў Амане цяпер. Даўно-даўно запланавалі візіт», — сказаў ён.

Паведамлялася, што ў ходзе рабочага візіту Аляксандра Лукашэнкі ў ААЭ асноўная ўвага ўдзелена прадаўжэнню і развіццю супрацоўніцтва ў гандлёва-эканамічнай, інвестыцыйнай, гуманітарнай і іншых сферах, што ўяўляюць узаемны інтарэс. Увогуле, сустрэча прэзідэнтаў доўжылася больш за гадзіну, пасля чаго Мухамед бен Заід аль-Нахаян асабіста праводзіў Аляксандра Лукашэнку да трапа самалёта. Лідары краін цёпла развіталіся.

> «Абавязкова прыязджайце! Нам ёсць аб чым пагаварыць», — запрасіў Прэзідэнт Беларусі.

Нагадаем, што ў ААЭ беларускі лідар прыбыў з рабочым візітам 18 снежня. Адразу ў аэрапорце ён правёў перагаворы з дзяржаўным міністрам знешняга гандлю ААЭ Тані Бэн Ахмедам Аль Заюдзі. Адной з ключавых тэм гэтага візіту стала ўзаемадзеянне ў галіне высокіх тэхналогій. Асаблівая ўвага пры гэтым была аддадзена сферы штучнага інтэлекту, які ў апошнія гады імкліва развіваецца ў свеце. Гэтыя пытанні абмяркоўваліся на сустрэчы з міністрам інвестыцый ААЭ, выканаўчым дырэктарам інвестыцыйнага фонду ADQ Махамедам Хасанам Аль-Сувейдзі. Аляксандр Лукашэнка таксама правёў перагаворы з кіраўніцтвам кампаній, якія працуюць у галіне высокіх тэхналогій, уключаючы сферу штучнага інтэлекту.

# «Я ЎРАЖАНЫ ТЫМ, ШТО ВЫ РОБІЦЕ Ў МАСКВЕ»

## Якія кірункі дапамогуць дасягнуць цалкам рэальных сямі мільярдаў тавараабароту

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў сустрэчу з мэрам Масквы Сяргеем Сабяніным, які знаходзіцца з рабочым візітам у Мінску. У графіку маскоўскай дэлегацыі — перагаворы з прэм'ер-міністрам Беларусі Раманам Галоўчанкам, старшынёй Мінскага гарвыканкама Уладзімірам Кухаравым, наведванне Мінскага трактарнага завода. Але найперш — візіт у Палац Незалежнасці.**



Фота БелТА.

У сустрэчы, якая прайшла ў кабінеце беларускага лідара, удзельнічаў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Дзмітрый Крутой, які раней займаў пасаду пасла Беларусі ў Расіі. Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Дзмітрый Крутой працягвае адказваць за супрацоўніцтва з Расіяй.

«Вы маштабна робіце тое, што мы маглі б рабіць у Мінску, але не маем на гэта такіх магчымасцяў, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Самі сябе суцяшаем тым, што магчымасцяў не хапае, але мы вучымся, падглядваем у вас і шмат якія рэчы пераймаем». Як адзін з прыкладаў ён прывёў рэнавацыю, якая актыўна праводзіцца ў Маскве. Падобныя праекты ажыццяўляюцца і ў беларускай сталіцы. «Мы гэтым шляхам ідзём, рэанімуючы Мінск, прыводзячы яго ў парадак, дзе трэба, зносім будынкі, паляпшаем жыццё людзей, робім добраўпарадкаванне», — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка.

> Шчыра кажучы, цяжка паверыць, што мы можам дасягнуць такога ўзроўню, але гэта вельмі салідна.

У мінулым годзе тавараабарот паміж Масквой і Беларуссю дасягнуў шасці мільярдаў долараў. Сёлета гэтая лічба была дасягнута па выніках студзеня — кастрычніка. І, як падкрэсліў беларускі лідар, ужо замахнуліся на лічбу ў сем мільярдаў. «Шчыра кажучы, цяжка паверыць, што мы можам дасягнуць такога ўзроўню, але гэта вельмі салідна. Я ўражаны тым, што вы робіце ў Маскве. Нават, здавалася б, тое, што не ўласціва для вас. Асабліва апошнім часам, калі я чую, што вы і беспілотнікі пачалі рабіць, дапамагаючы расійскай арміі, гэта наогул перспектыўны кірунак», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

> Я думаю, рана ці позна, неўзабаве Еўропа адкрыецца для нас. Адкрыецца ў тым плане, што Еўропа не можа без Расіі існаваць. Без нас яна існаваць не можа, таму патрэбны добрыя хуткасныя дарогі.

### «МАСКВІЧЫ» І ІНШЫЯ АЎТАМАБІЛІ — ГЭТА НАША З ВАМІ АГУЛЬНАЕ

Асобную ўвагу Прэзідэнт звярнуў на аўтамабілебудаванне: «Вельмі вас падтрымліваю, што вы, махнуўшы рукой на гэтыя заходнія санкцыі, пачалі выпускаць свае аўтамабілі, якія мы некалі добра ведалі, але на больш высокім узроўні». Ён выказаў меркаванне, што ў гэтых праектах можа знайсціся месца і для Беларусі, асабліва ў плане аўтакампанентаў і іншага. Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што ў Беларусі па кітайскіх тэхналогіях выпускаюцца аўтамабілі BELGEE. Прычым гэта далёка не зборачная вытворчасць.«Нядаўна Дзяніс Мантураў (першы намеснік старшыні ўрада Расіі) спецыяльна прыязджаў. Я Пуціна папрасіў: прышлі, няхай ён паглядзіць, мы збіраем ці нешта вырабляем. Ён паглядзеў і гаворыць: гэта завод сапраўдны, — расказаў Аляксандр Лукашэнка. — Але вучыцца мы ў вас будзем абавязкова, таму што і «масквічы», і іншыя аўтамабілі — гэта наша з вамі агульнае».

Беларускі лідар падзякаваў мэру Масквы за афармленне выставачнага цэнтра Беларусі на ВДНГ. Ён заўважыў, што на прадукцыю, якую мы там выстаўляем, попыт шалёны: і на прадукты харчавання, і на адзенне. Яны па цане і па якасці падыходзяць масквічам.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што ў Беларусі і Масквы ёсць і іншыя кропкі судакранання. «Вы ведаеце, што мы вельмі хацелі б супрацоўнічаць з Масквой. Гэта побач, гэта наш родны горад, нашы людзі там мільёнамі жывуць, бываюць вельмі задаволеныя. На Новы год многія едуць у Маскву, проста фатаграфуюцца на асобных лакацыях. Я гэта падтрымліваю, вельмі рады. Я арыентую Прэзідэнта Расіі на тое, каб у гэтым вялізным будаўніцтве хуткасных чыгунак мы, можа быць, аддалі прыярытэт трасе праз Мінск на Брэст — святое месца для рускіх і беларусаў, для ўкраінцаў, для ўсіх народаў Савецкага Саюза. Я думаю, рана ці позна, неўзабаве Еўропа адкрыецца для нас. Адкрыецца ў тым плане, што Еўропа не можа без Расіі існаваць. Без нас яна існаваць не можа, таму патрэбны добрыя хуткасныя дарогі. Ды і для таго, каб беларусы хутчэй маглі прыехаць у Маскву і наадварот», — сказаў ён. Кіраўнік дзяржавы запэўніў, што на ўзроўні прэзідэнтаў робіцца ўсё, каб вырашыць гэтыя пытанні, каб звязаць Маскву і Мінск, пры гэтым не страціць Санкт-Пецярбург. «Гэты трохвугольнік павінен працаваць. Я думаю, што хутка і Кіеў будзе працаваць з намі, нідзе не падзенуцца, бо ўсё ж такі мы людзі свае. Усякае ў жыцці бывае, але, я думаю, нармалізуем з імі адносіны», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Асобную ўвагу ён звярнуў на культурныя стасункі. На гэтым тыдні стартуюць мерапрыемствы Дня Масквы ў беларускай сталіцы. Прэзідэнт заўважыў, што для беларусаў гэта вельмі важна, паколькі нашы людзі ведаюць Маскву, любяць Маскву і шмат чаму ў яе вучацца, асабліва ў плане культуры. «Нашы людзі з задавальненнем прымаюць вашу вялізную дэлегацыю ў Беларусі. Гэта на карысць нашым адносінам», — падсумаваў кіраўнік дзяржавы.

**У тэму**

### Прэм'ер-міністр Раман Галоўчанка і мэр Масквы Сяргей Сабянін правялі сустрэчу ў фармаце рабочага абеду

Як паведамілі ў прэс-службе ўрада, бакі абмеркавалі пытанні прамкааперацыі, пастаўкі беларускай камунальнай тэхнікі і харчавання ў Маскву.

На парадку дня былі і іншыя пытанні двухбаковага ўзаемадзеяння.

## «МАСКВІЧЫ ВЕЛЬМІ ЛЮБЯЦЬ БЕЛАРУСКУЮ ПРАДУКЦЫЮ»

У сваю чаргу Сяргей Сабянін адзначыў добрую дынаміку ў гандлёва-эканамічных адносінах. «Масква для Мінска з'яўляецца, напэўна, галоўным партнёрам. За апошнія два гады амаль на 30 працэнтаў вырас тавараабарот, па шэрагу пазіцый — яшчэ больш. Па будаўнічых матэрыялах амаль на 60 працэнтаў. Па вуліцах ходзяць сотні, калі не тысячы адзінак камунальнай тэхнікі, выраблена у Беларусі: трактары, машыны, снегаўборачная тэхніка.

**Па харчаванні Беларусь для нас — партнёр нумар адзін. Амаль ва ўсіх магазінах Масквы, на кірмашах можна купіць беларускую прадукцыю, масквічы яе любяць, яна вельмі якасная, экалагічна чыстая прадукцыя», — сказаў ён.**

Мэр Масквы звярнуў увагу, што станоўчая дынаміка назіраецца ва ўсіх абласцях: электроніцы, машынабудаванні, медыцыне і іншых. Ён падкрэсліў, што гэта магчыма дзякуючы вялікай рабоце, якая штодзённа вядзецца на ўзроўні МЗС, урада Масквы, асобных падраздзяленняў. «Работа ідзе ўвесь час. Мы, можа, не так моцна афішуем яе, але вынік сам па сабе гаворыць пра гэта», — падкрэсліў Сяргей Сабянін.

**Мэр Масквы падкрэсліў, што за гэты год турыстычныя патокі паміж Беларуссю і расійскай сталіцай павялічыліся амаль на 50 працэнтаў. «Было нейкае запаволенне, відаць, звязанае з ковідам, пачаткам спецаперацыі. Але цяпер усё аднаўляецца. Думаю, мы адновім аб'ём турыстычнага патоку. Масквічам падабаецца прыязджаць у Беларусь, Мінск — гэта адзін з самых папулярных напрамкаў», — падкрэсліў ён.**

### У тэму

### СЛАБЫХ МЕСЦАЎ У СУПРАЦОЎНІЦТВЕ НЯМА

Журналістам Сяргей Сабянін расказаў, што на сустрэчы з беларускім лідарам яны абмеркавалі самы шырокі спектр пытанняў: пачынаючы ад гандлёвых адносін, развіцця прамысловасці, фармацэўтыкі, электронікі да пытанняў сацыяльных сувязяў у галіне адукацыі, аховы здароўя, развіцця штучнага інтэлекту. «Я думаю, што гэта сустрэча дасць добры штуршок у адносінах не толькі Мінска і Масквы, але і Масквы з усёй Рэспублікай Беларусь. Сустрэча была вельмі важнай і плённай», — падкрэсліў ён. Па словах мэра Масквы, слабых месцаў у супрацоўніцтве няма. За апошнія два гады тавараабарот вырас амаль на 30 працэнтаў. «Можна толькі пажадаць, каб і ў далейшым так развіваліся нашы адносіны», — рэзюмаваў Сяргей Сабянін.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# «НАШЫ ТРАДЫЦЫЙНЫЯ РЫНКІ, ДЗЕ МЫ ПРАЦАВАЛІ ПАСПЯХОВА, ТРЭБА ПАШЫРАЦЬ»

## Якое пытанне галоўнае для айчыннага машынабудавання

> **Літаральна праз пару дзён мы сустрэнемся з Уладзімірам Уладзіміравічам Пуціным. І калі трэба будзе абмеркаваць на нашым узроўні нейкія пытанні, мы іх абмяркуем.**

На сустрэчы з Сяргеем Сабяніным Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка абмяркоўваў магчымасці ўдзелу беларусаў у маскоўскіх праектах у галіне аўтамабілебудавання. Гэта сфера стала тэмай для другога мерапрыемства ў графіку кіраўніка дзяржавы на панядзелак — нарады па пытаннях развіцця машынабудавання.

«На гэтай невялікай нарадзе я хацеў бы з вамі пагаварыць аб рабоце асобных прамысловых прадпрыемстваў і ў цэлым аб сектары машынабудавання. Ведаю, што ўсе стараюцца, што выбары — гэта экзамен. Не толькі экзамен Прэзідэнта дзеючага, але і ўсёй вертыкалі ўлады. Але, давайце шчыра, ёсць прадпрыемствы, якія не сёння дык заўтра могуць атрымаць праблемы, і мы гэта павінны бачыць», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Ён засяродзіўся на супрацоўніцтве з замежнымі партнёрамі і расставіў акцэнты.

> **Не ўсё мы паказваем сёння, таму што гэтыя мярзотнікі там бегаюць, асабліва нашы. І ўсё выпрошваюць санкцыі ў амерыканцаў, у Захаду, каб яны супраць нас уводзілі ўсё новыя.**

### Мы дамовіліся сінхранізаваць нашы адносіны з Расіяй

«Гаворачы аб нашых аўтамабілях і гэтак далей, мы дамовіліся з Расіяй сінхранізаваць нашы адносіны. Я б вас папрасіў, каб мы дакладна прытрымліваліся нашых дамоўленасцяў з Расійскай Федэрацыяй. Трэба разумець, што ў Расіі таксама часы няпростыя. Утылізацыйны збор — мы таксама дамовіліся. Як гэта рэалізоўваецца на сённяшні дзень і ці ёсць нейкія праблемы ў нас з Расійскай Федэрацыяй? Гэта вельмі актуальна ў сувязі з тым, што літаральна праз пару дзён мы сустрэнемся з Уладзімірам Уладзіміравічам Пуціным. І калі трэба будзе абмеркаваць на нашым узроўні нейкія пытанні, мы іх абмяркуем», — сказаў беларускі лідар. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што ў гэтай сферы перспектыўным бачыцца і супрацоўніцтва з Масквой. «Яны малайцы. Малайчына Сабянін. Ён пачаў вытворчасць марак нашых аўтамабіляў савецкіх. Пад брэндам «Масквіч», «ГАЗ» і гэтак далей. Але гэта зусім іншыя аўтамабілі, гэта зразумела. І яны тут вельмі сур'ёзна прасунуліся, і ў іх вялікая цікавасць да нас. Не толькі па аўтакампанентах, але і па іншых кірунках», — падкрэсліў беларускі лідар.

### Дыверсіфікацыя застаецца ў тэме

«Я пра гэта кажу ўжо які раз, што будучы год будзе няпростым. У сілу пэўных прычын. І нашы традыцыйныя рынкі, дзе мы працавалі паспяхова, трэба пашыраць», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. Ён расказаў, што галоўная тэма яго візітаў у Аман, Аб'яднаныя Арабскія Эміраты, будучы візіт у Кітай — дыверсіфікацыя рынкаў. «Не ўсё мы паказваем сёння, таму што гэтыя мярзотнікі там бегаюць, асабліва нашы. І ўсё выпрошваюць санкцыі ў амерыканцаў, у Захаду, каб яны супраць нас уводзілі ўсё новыя. Таму мы не ўсё, вядома, паказваем і расказваем», — заўважыў Аляксандр Лукашэнка.

> **Я пра гэта кажу ўжо які раз, што будучы год будзе няпростым. У сілу пэўных прычын. І нашы традыцыйныя рынкі, дзе мы працавалі паспяхова, трэба пашыраць», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.**

Асобную ўвагу Прэзідэнт удзяліў вытворчасці легкавых аўтамабіляў. «Мы пачалі выпускаць. Замахнуліся на вялікую колькасць. Але трэба разумець, колькі мы будзем выпускаць у будучым годзе, і бачыць рынкі для рэалізацыі гэтых аўтамабіляў. Гэта значыць, дыверсіфікацыя застаецца ў тэме», — заявіў ён.

**Валерыя СЦЯЦКО.**



Фота БелТА.

### У тэму

### Дыверсіфікацыя экспарту — адна з ключавых задач

Журналістам міністр прамысловасці Аляксандр Яфімаў расказаў, што на нарадзе быў разгледжаны комплекс пытанняў, звязаных з развіццём машынабудаўнічай галіны, пастаўлены задачы па далейшым развіцці аўтамабілебудавання, дадзены даручэнні па нарошчванні аб'ёмаў вытворчасці, узроўню лакалізацыі легкавых аўтамабіляў. «Ключавым пытаннем для разгляду была дыверсіфікацыя экспарту беларускіх прамысловых тавараў у трэція краіны, краіны далёкай дугі, у тыя краіны, дзе мы сёння альбо мала прысутнічаем, альбо не прысутнічаем зусім. І гэтаму пытанню ўдзелена асаблівая ўвага, паколькі наступны год прагназуецца складаным, і дыверсіфікацыя экспарту — адна з ключавых задач, якую трэба вырашыць для далейшага развіцця прамысловага комплексу, павелічэння аб'ёмаў вытворчасці і гэтак далей», — расказаў Аляксандр Яфімаў.

Міністр падкрэсліў, што тэмпы нарошчвання вытворчасці легкавых аўтамабіляў абсалютна карэлююць з рыначнымі задачамі і мэтамі. «Рынак Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі дастатковы для таго, каб развіваць нашы аўтазборачныя вытворчасці як на тэрыторыі Беларусі, так і ў Расійскай Федэрацыі. Мы сёння аб'ядноўваем намаганні з мэтай развіцця нашых аўтамабільных прадпрыемстваў. Для гэтага трэба стварыць уласную ўніфікаваную кампанентную базу, па камплектуючых», — распавёў ён. Што тычыцца беларускага ўдзелу ў праекце па развіцці «Масквіча», па словах міністра, гэтая тэма не новая, у маскоўскіх партнёраў ёсць цікавасць, у тым ліку па стварэнні ўніфікаванай кампанентнай базы, якую можна выкарыстоўваць і на «Масквічы», і на беларускіх зборачных прадпрыемствах. Паводле слоў Аляксандра Яфімава, у супрацоўніцтве Беларусі і Расіі ў галіне машынабудавання няма непаразуменняў, усе дасягнутыя дамоўленасці выконваюцца. «Мы вядзём работу па пошуку варыянтаў рэалізацыі наступнага этапу інвестыцыйных праектаў, імпартазамяшчальных, інтэграцыйных, якія рэалізоўваюцца на тэрыторыі нашай краіны з прыцягненнем капіталу з Расійскай Федэрацыі. Магчыма, гэта пытанне стане адной з тэм абмеркавання паміж кіраўнікамі дзяржаў. Прынамсі, на мінулым тыдні пасля сустрэчы ў расійскім Мінпрамгандлі з маім калегам мы прагаворвалі магчымасць унясення на разгляд кіраўнікоў дзяржаў менавіта гэтага пытання», — распавёў міністр.

# «БУДУЧЫНЯ ЗАЛЕЖЫЦЬ АД УСІХ НАС»

## Наталля КАЧАНАВА сустрэлася з удзельнікамі «Школы маладога выбаршчыка»

**Міралюбівая палітыка нашай краіны, развіццё па сваіх законах — гэта дарагога варта, заявіла Старшыня Савета Рэспублікі падчас сустрэчы з удзельнікамі праекта БДУ «Школа маладога выбаршчыка».**

Маладзёжны патрыятычны праект, які рэалізоўваецца ў вядучай ВНУ краіны са снежня гэтага года да студзеня 2025-га, накіраваны на разуменне працэдуры выбарчага працэсу ў Рэспубліцы Беларусь. Яго ўдзельнікамі з'яўляюцца студэнты ўсіх факультэтаў БДУ, якія раней не прымалі ўдзел у выбарах Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Мэта праекта — адукацыя студэнцкай моладзі па тэматыцы выбарчага працэсу ў Рэспубліцы Беларусь, фарміраванне прававой культуры, грамадзянскай пазіцыі і разумення адказнасці за будучыню краіны.

Праект мае на ўвазе ў тым ліку правядзенне дыялогавых пляцовак з вышэйшымі службовымі асобамі дзяржавы, лідарамі грамадскай думкі, экспертамі, падчас якіх студэнты маюць магчымасці пачуць кампетэнтнае меркаванне, задаць свае пытанні. На такую пляцоўку і завітала ўчора спікер Савета Рэспублікі.

**«Выбары для любой прававой дзяржавы — гэта асаблівы перыяд у жыцці краіны, — сказала Наталля Качанава. — Наша краіна за 30 гадоў, невялікі перыяд па гістарычных мерках, зрабіла вялікі рывок у сваім развіцці. Тым, што**





Фота БелТА.

**дасягнула Беларусь, мы па праве ганарымся. Самае галоўнае — гэта суверэнітэт і незалежнасць. Міралюбівая палітыка нашай краіны, развіццё па сваіх законах — гэта дарагога варта. Але вы павінны разумець, што будучыня залежыць ад усіх нас. Кожны голас сёння вельмі важны».**

Моладзь цікавіцца жыццём сваёй краіны, адзначыла Наталля Качанава. «І тое, што сёння думае моладзь і як па-рознаму бачыць шляхі развіваць нашу дзяржаву, вельмі важна, — падкрэсліла Старшыня Савета Рэспублікі. — Трэба захаваць наша адзінства для таго, каб Беларусь была такой жа міралюбнай у знешняй палітыцы, каб мір і згода былі ў нашай краіне, каб яна развівалася так, як усе гэтыя 30 гадоў, — прырастаючы ў эканоміцы, сацыяльнай сферы, сваімі традыцыямі».

**Паводле БелТА.**

### «НАША МОЛАДЗЬ СЁННЯ БОЛЬШ ПАЛІТЫЗАВАНАЯ»

Па выніках сустрэчы з моладдзю Наталля Качанава ў размове з журналістамі адзначыла, што такі праект можа стаць прыкладам для іншых устаноў адукацыі.

«Такая ініцыятыва, якая сёння ёсць у Беларускім дзяржаўным універсітэце, — «Школа маладога выбаршчыка» — па-мойму, вартая працягу. Мне здаецца, іншыя ВНУ могуць выкарыстоўваць гэта ў сваёй рабоце. Таму што юнакі і дзяўчаты глыбока вывучылі выбарчы працэс і тыя законы, якія дзейнічаюць у нашай краіне. Акрамя таго, яны паспрабавалі нават напісаць праграмы кандыдатаў у Прэзідэнты. Для нас гэта цікава. Я папрасіла потым азнаёміць нас з гэтымі праграмамі. Таму што ўбачыць праграму вачыма маладога чалавека, студэнта — гэта вельмі важна», — сказала Наталля Качанава.

«Сёння наша моладзь больш палітызаваная, чым былі мы некалі, — падкрэсліла спікер. — Хлопцы і дзяўчаты задавалі вельмі цікавыя пытанні, якія іх хвалююць. Я адчула, што яны сапраўды паглыблены ў тыя працэсы, якія адбываюцца не толькі ў нашай краіне, але і ў свеце ў цэлым. Таму мне было вельмі цікава сёння быць на гэтай сустрэчы і адказваць на пытанні хлопцаў і дзяўчат. Відома, яны думаюць пра будучыню сваёй краіны, пра тыя выклікі і пагрозы, якія ёсць сёння ў маладых людзей. Добры атрымаўся дыялог, на мой погляд».

Дабрачыннасць

# ПАДАРЫЦЬ ЦУДОЎНАЕ СВЯТА

## У рамках акцыі «Нашы дзеці» Ігар СЕРГЯЕНКА наведаў Маладзечанскую спецыяльную школу-інтэрнат



Фота БелТА.

**Акцыя праходзіць па ініцыятыве і пад патранатам Прэзідэнта. Яна, па словах Старшыні Палаты прадстаўнікоў, — візітная картка нашай сацыяльна арыентаванай дзяржавы, а таксама мост паміж рознымі пакаленнямі.**

— Сёння гэта своеасаблівы ўнікальны мост сувязі пакаленняў, калі мы, дарослыя, становімся чараўнікамі на некалькі імгненняў і дорым гэтым выдатным дзецям свята, — падкрэсліў Ігар Сергяенка ў размове з журналістамі. Ён заўважыў, што радасныя твары дзяцей і педагогаў, якія аддаюць усе свае сілы, сваю душу падрастаючаму пакаленню, пацвярджаюць, што кіраўнікі, грамадскія дзеячы робяць усё правільна.

Дарэчы, Маладзечанскую спецыяльную школу-інтэрнат спікер наведвае пяты раз і адзначае станоўчую дынаміку яе развіцця.

**«Гэтая выдатная школа-інтэрнат кожны год прырастае чымсьці новым. А новае — дзякуючы творчаму калектыву педагогаў, якія твораць, робяць цуды і на сцэне, і ў зале, і на ўваходзе ў будынак», — сказаў ён. Прычым робяць яны гэта звыш асноўнай працы: «Я ўжо не кажу пра тое, што робіцца сёння для дзяцей, якая існуе матэрыяльная база, які моцны калектыў педагогаў», — зазначыў Старшыня Палаты прадстаўнікоў.**

Ігар Сергяенка цёпла павіншаваў з надыходзячымі святамі ўсіх дзяцей, пажадаў ім здароўя, поспехаў у вучобе, жыцці, здзяйснення ўсіх жаданняў. Да яго віншаванняў таксама далучыліся дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, якія прадстаўляюць Мінскую вобласць: старшыня Пастаяннай камісіі па аграрнай палітыцы Іван Маркевіч і член Пастаяннай камісіі па экалогіі і прыродакарыстанні Дзяніс Ушацкі.

**Паводле БелТА.**

### Даведка

Маладзечанская спецыяльная школа-інтэрнат адкрыта ў 1964 годзе. У рамках дзейнасці школы створана мадэль школы-інтэрната з адаптаваным вучэбна-выхаваўчым працэсам з улікам асаблівасцяў псіхафізічнага развіцця дзяцей з парушэннямі зроку. Медыцынскае суправаджэнне разглядаецца ў школе як важная частка ўсяго вучэбна-выхаваўчага працэсу. Рэкамендацыі медыкаў улічваюцца педагогамі пры вызначэнні выбару карэкцыйна-развіццёвых заняткаў.

Ва ўстанове працуе сацыяльна-псіхалагічная служба, якая ажыццяўляе індывідуальны падыход у сацыяльнай і псіхалагічнай адаптацыі дзяцей. Навучальныя заняткі праводзяцца ў адну змену. Напаўняльнасць класаў — да 12 чалавек. У школе створаны ўмовы для развіцця творчых здольнасцяў навучэнцаў. Дзейнічаюць гурткі танца, музыкі, роспісу па дрэве, тэхнічнай і абслуговай працы, фальклорная студыя і іншыя.

Створана добрая матэрыяльная база: па ўсіх асноўных прадметах абсталяваны навучальныя кабінеты, працуюць майстэрні тэхнічнай і абслуговай працы, спартыўная і трэнажорная залы, відэасалон, музычная студыя, камп'ютарны клас.

У школе-інтэрнаце для навучэнцаў бясплатныя лячэнне, пяціразовае харчаванне, пражыванне, навучанне і падручнікі.

Пасля заканчэння школы ўсім вучням выдаецца атэстат аб сярэдняй адукацыі агульнага ўзору. Выпускнікі школы-інтэрната маюць права паступаць у любыя прафесійныя, сярэднія спецыяльныя і вышэйшыя навучальныя ўстановы з улікам патрабаванняў да стану здароўя.

# НАПЕРАДЗЕ — НОВЫ ЭТАП

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Па словах старшыні Цэнтрвыбаркама, ва ўстаноўлены законам тэрміны ўтвораны ўчасткі для галасавання ў колькасці 5325. У такой жа колькасці не пазней за 26 снежня будуць утвораны ўчастковыя камісіі. Да 30 снежня на сайце ЦВК будзе запушчана работа сэрвісу па пошуку ўчастка для галасавання.

**«Пры тэрытарыяльных камісіях ужо акрэдытаваны 951 нацыянальны наглядальнік, — звярнуў увагу Ігар Карпенка. — Для ажыццяўлення назірання за выбарамі ў краіне ўжо акрэдытаваны 93 замежныя (міжнародныя) наглядальнікі. Сярод іх — наглядальнікі місіі ад СНД, парламентарыі, прадстаўнікі Маладзёжнай арганізацыі Руху недалучэння, выбарчых органаў замежных дзяржаў, незалежныя наглядальнікі».**

Нагадаем, 18 снежня адбылася сустрэча старшыні Цэнтрвыбаркама з кіраўніком Місіі наглядальнікаў ад СНД Сяргеем Лебедзевым. «Сяргей Мікалаевіч паведаміў, што ў Выканаўчым камітэце СНД у Мінску пачаў работу штаб місіі, у якім будуць працаваць больш як 50 доўгатэрміновых наглядальнікаў, — адзначыў Ігар Карпенка. — За дзень-два да выбараў у Беларусь прыбудзе яшчэ каля 150 наглядальнікаў. Агульная колькасць місіі — парадку 200 чалавек».

Цэнтральная выбарчая камісія працягвае акрэдытацыю замежных (міжнародных) наглядальнікаў.

## Форма бюлетэня і эфірны час

Акрамя рэгістрацыі кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь, на пасяджэнні ЦВК разглядзелі пытанне аб устанаўленні формы і тэксту бюлетэня для галасавання. Ён будзе ўтрымліваць прозвішча, імя і імя па бацьку ў алфавітным парадку, іншыя даныя ўсіх кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь. Акрамя таго, у бюлетэнь будуць уключаны тлумачальная інфармацыя аб парадку яго запаўнення. Нагадаюць выбаршчыкам і аб тым, што выдадзены бюлетэнь забараняецца выносіць за межы памяшкання для галасавання, забаронена ажыццяўляць фота- і відэаздымку запоўненага бюлетэня.



Зацверджана, што тэкст бюлетэня будзе на беларускай мове.

На пасяджэнні ЦВК таксама разгледжана пытанне аб арганізацыі галасавання асобных катэгорый грамадзян. Размова аб беларусах, якія пражываюць за мяжой. Яны таксама змогуць рэалізаваць сваё канстытуцыйнае права, але толькі на тэрыторыі нашай краіны — адпаведныя ўчасткі будуць арганізаваны ў Мінску і кожным абласным цэнтры (адрасы гэтых участкаў змешчаны на сайце і тэлеграм-канале Цэнтрвыбаркама, будуць апублікаваны ў СМІ). Як нагадалі ў ЦВК, бюлетэнь для галасавання будзе выдавацца на адным з указаных участкаў па прад'яўленні пашпарта, ідэнтыфікацыйнай карты, біяметрычнага пашпарта грамадзяніна Рэспублікі Беларусь.

Вызначаны даты і час перадвыбарных выступленняў кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь па тэлебачанні і радыё — адпаведная жараб'ёўка была праведзена падчас пасяджэння ЦВК. 9 студзеня 2025 года па тэлебачанні выступленні будуць транслiравацца ў наступным парадку: Ганна Канапацкая, Сяргей Сыранкоў, Аляксандр Хіжняк, Алег Гайдукевіч. 16 студзеня першым выступіць Аляксандр Хіжняк, затым — Ганна Канапацкая, Сяргей Сыранкоў і Алег Гайдукевіч. У радыёэфіры выступленні будуць транслiравацца ў наступным парадку: 8 студзеня — Алег Гайдукевіч і Аляксандр Хіжняк, 10 студзеня — Ганна Канапацкая і Сяргей Сыранкоў, 15 студзеня — Сяргей Сыранкоў і Ганна Канапацкая, 17 студзеня — Алег Гайдукевіч і Аляксандр Хіжняк. Аляксандр Лукашэнка адмовіўся ад перадвыбарных выступленняў па тэлебачанні і радыё.

У размове з журналістамі Ігар Карпенка выказаў падзяку людзям, якія працавалі ў ініцыятыўных групах патэнцыяльных кандыдатаў у Прэзідэнты. «Вынік праверкі подпісаў і ў цэлым гэты працэс былі дастаткова якаснымі, — рэзюмаваў ён. — Усе прэтэндэнты набралі тую колькасць подпісаў, якая неабходная па законе для вылучэння, падалі ўсе дакументы. Усе пяць прэтэндэнтаў адпавядаюць патрабаванням заканадаўства, якія вызначаны для кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь».

З 1 да 25 студзеня 2025 года пройдзе перадвыбарная агітацыя. Выбары Прэзідэнта Беларусі прызначаны на 26 студзеня 2025 года. Грамадзян, якія будуць галасаваць упершыню, чакае падарунак ад Цэнтральнай выбарчай камісіі.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота БелТА.**

## Задача ад Першага

*Традыцыйна, як у нас гэта бывае, падчас старту перадвыбарнай выбарчай кампаніі. Задача наша — правесці яе на высокім узроўні. Арганізацыйным перш за ўсё.*

*Аляксандр Лукашэнка падчас нарады па пытаннях правядзення выбараў 2025 года. 5 лістапада 2024 года.*

## «Выбарчая кампанія праходзіць на высокім арганізацыйным узроўні»

**Старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Ігар КАРПЕНКА:**

— На дадзеным этапе выбарчая кампанія праходзіць на высокім арганізацыйным узроўні. Мы ўстанавілі добрую зваротную сувязь з усімі камісіямі, уключаючы ўчастковыя. У нас працуе прамая тэлефонная лінія з грамадзянамі, якія да нас звяртаюцца. З моманту фарміравання ўчастковых і тэрытарыяльных камісій у нас ёсць асобны тэлефон, які працуе толькі на гэтыя камісіі. Камісіі могуць звярнуцца на гэты тэлефон, і пры неабходнасці іх злучаць нават са старшынёй Цэнтральнай выбарчай камісіі. Мы падрыхтавалі адпаведныя метадычныя рэкамендацыі. Як толькі ўчастковыя камісіі будуць сфарміраваны (апошні дзень фарміравання — 26 снежня), метадычныя рэкамендацыі будуць перададзены. Пасля выбрання кіраўнікоў участковых камісій плануем правесці трэнінгі. Для гэтага падрыхтавалі звыш 200 трэнераў. Для таго, каб камісіі маглі наглядна разумець, як ажыццяўляецца выбарчы працэс (там, вядома, працуюць і дасведчаныя людзі), каб яшчэ раз асвяжыць гэта ў памяці, мы з Белтэлерадыёкампаніяй падрыхтавалі навучальны фільм аб дзейнасці ўчастковай выбарчай камісіі (па аналогіі з адзіным днём галасавання). Акрамя таго, падрыхтавалі адпаведныя ролікі для нашых выбаршчыкаў, якія будуць нагадваць, калі ажыццяўляецца датэрміновае галасаванне, як можна прагаласаваць дома, як будзе ісці галасаванне ў асноўны дзень галасавання і іншае. Візуальную канцэпцыю зацвердзілі: разам з навагоднімі ўпрыгажэннямі ўсюды можна заўважыць інфармацыю аб маючых адбыцца прэзідэнцкіх выбарах і даце іх правядзення.

**Вераніка КАНЮТА.**

На кантролі Прэзідэнта

# «Задача — каб усё было па справядлівасці і па-сумленнаму»

## Кароткае замыканне: Аляксандр Субоцін назваў папярэднюю прычыну пажару ў ГЦ у Віцебску

**Старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр СУБОЦІН у эфіры тэлеканала АНТ агучыў папярэднюю прычыну пажару, які адбыўся 13 снежня ў адным з гандлёвых цэнтраў Віцебска.**

— Прычыны толькі папярэднія. Гэта няякасна зробленая праводка, яе няспраўнасць, якая прывяла да перагрузкі сістэмы і кароткага замыкання, — адзначыў Аляксандр Субоцін. — Экспертыза завяршылася дзесьці ў сераду, усе матэрыялы пайшлі, цяпер ідуць першасныя следчыя дзеянні. У найбліжэйшы час будзе агучана афіцыйная версія.

Гаворачы аб прычынах узгарання, старшыня аблвыканкама адзначыў, што нельга выключаць і чалавечы фактар:

— Як паказвае практыка, чалавечы фактар заўсёды адыгрывае вядучую ролю. Будзем правяраць усіх, — адзначыў Аляксандр Субоцін. — Асаблівая ўвага — гандлёвым цэнтрам уладальніка таго ГЦ, у якім адбыўся пажар. Маё даручэнне — каб гэта прайшло максімальна незаўважна і камфортна як для тых, хто гандлюе, так і для тых, хто купляе. Вядома, калі будуць выяўлены нейкія факты, тады будзем падыходзіць жорстка і прынцыпова. Але ніхто не будзе паралізоўваць дзейнасць цэнтраў, работу нейкіх прадпрыемстваў, калі на тое няма важкіх прычын.

Аляксандр Субоцін таксама расказаў, як і каму будзе аказана дапамога:

— Першае: хацелася б дапамагчы тым, хто ў гэтым рэальна мае патрэбу. Бо на бядзе сёй-той пачынае зарабляць. Як у тым фільме: «скралі тры курткі». Так яно і тут ужо дзесьці атрымліваецца. Але гэта ж прыватны гандлёвы цэнтр. І людзі працавалі па арэндзе. І кампенсаваць, і дапамагаць, вядома, у прыярытэце павінен уладальнік гэтага гандлёвага цэнтра. Наша задача — глядзець, каб усё было па справядлівасці і па-сумленнаму. Але мы не ўмываем рукі. У нас ёсць некалькі афіцыйных механізмаў, як людзям дапамагаць. Дзесьці нават прымусіць уладальніка даць арэндныя плошчы. У яго ў Віцебску дзевяць гандлёвых цэнтраў. Звярнуліся ўжо 50 чалавек. Яны будуць адкрываць свае пункты ў іншых гандлёвых цэнтрах.

Нагадаў Аляксандр Субоцін і пра афіцыйны механізм — праз «Белдзяржстрах».

— Ім трэба падаць пакет дакументаў. Створаны чат у Viber. Існуе некалькі прамых ліній. На дадзены момант звярнулася 31 юрыдычная і фізічная асоба.

**По матэрыялах sb.by**

Центр Промышленной Оценки

• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| Продавец | СТОАО «Світанак», Гродненская обл., г. Слоним, ул. Красноармейская, д. 4. УНП 500041006 |
| Оператор ЭТП | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. УНП 191224638 – **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов (одним лотом)**

**• 31/50 доли в праве собственности на здание нежилое**
(назначение: здание нежилое, инв. № 450/С-2946, 6158,8 кв. м, составные части: подвал, бордюры, покрытия, благоустройство, газон), адрес:
**Гродненская обл., Слонимский р-н, г. Слоним, ул. Коссовский Тракт, 100;**

**• канализационные сети**
(сооружение специализ. коммун. хозяйства, инв. № 450/С-31477, 82,6 м), адрес: Гродненская обл., Слонимский р-н, г. Слоним, 273, канализ. сеть

**Начальная цена лота с НДС 20 % – 3 818 184,00 бел. руб.**

***Сведения о земельных участках, на которых расположена 31/50 доля в праве собственности на здание нежилое с*** инв. № 450/С-2946:
1) пл. **0,8074 га** предоставлен на праве постоянного пользования;
2) пл. **0,0001 га** предоставлен на праве аренды (срок действия: по 11.05.2072);
3) пл. **0,0001 га** предоставлен на праве аренды (срок действия: по 11.05.2072);
4) пл. **0,0016 га** предоставлен на праве аренды (срок действия: по 11.05.2072)

**Обременения:** площади здания, принадлежащие продавцу, частично сданы в аренду. Подробная информация у организатора торгов и на сайте cpo.by

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BYN BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 30 (тридцать)** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати)** календарных дней после заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: **www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору торгов в размере 2 % от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 24.01.2025 с 11.00 до 12.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов.
**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 23.01.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (44) 704-92-06.**
**E-mail: auction@cpo.by**

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор аукциона)
извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества **ОАО «Криница»** (Продавец)

**Аукцион состоится 22.01.2025 в 11.00**
по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

**Лот № 1, состав:**
1. Контрольный пост и проходная, инв. № 621/С-1161, 66,5 кв. м.
2. Здание подсобного блока, инв. № 621/С-1163, 1138,5 кв. м.
3. Помещение мойки пивовозов, инв. № 621/С-1164, 113,6 кв. м.
4. Насосная станция над артскважиной, инв. № 621/С-1166, 50,1 кв. м.
5. Здание насосно-фильтровальной станции, инв. № 621/С-1168, 254,6 кв. м.
6. Сушильный цех, инв. № 621/С-1170, 264,2 кв. м.
7. Административное здание, инв. № 621/С-1171, 322,3 кв. м.
8. Здание главного корпуса, инв. № 621/С-1172, 4055,3 кв. м.
9. Сооружение: площадка для стеклобоя, инв. № 621/С-3617, 111,6 кв. м.
10. Здание котельной, инв. № 621/С-17178, 517 кв. м.
11. Внеплощадочные и площадочные сети водопровода, инв. № 621/С-20589, 2994 м.
12. Кабельная ЛЭП, инв. № 621/С-20588, 1196,7 м.
13. Внеплощадочные и площадочные сети канализации, инв. № 621/С-20587, 2462,2 м.
14. Низковольтные сети промплощадки, инв. № 621/С-20586, 3028 м.
15. Площадочные тепловые сети, инв. № 621/С-20584, 393 м.
16. Сети газопровода, инв. № 621/С-20581, 248 м.
17. Артскважина с насосом ЭВЦ 10х63-110, инв. № 621/С-1028912.
18. Благоустройство (проезды, площадки, ограждения), инв. № 621/С-1029402, площадь – 11366,0 кв. м.
19. Резервуар промывочной воды, инв. № 621/С-1029401, площадь – 27,0 кв. м.
20. Резервуар фильтрованной воды V 500 куб., инв. № 621/С-1029400, площадь – 148,3 кв. м.
21. Резервуар фильтрованной воды V 500 куб., инв. № 621/С-1029399, площадь – 151,5 кв. м.
22. Движимое имущество (перечень на электронной торговой площадке «GOSTORG»(gostorg.by)).
23. Объекты растительного мира (перечень на электронной торговой площадке «GOSTORG» (gostorg.by)).

**Адрес Лота № 1:** Минская обл., Несвижский р-н, г. Несвиж, ул. Кутузова, 7; 7/5; 7/2; 7/1; 7/4; 7/9; 7/8; 7/7; 7/6.
Артскважина: Минская обл., Несвижский р-н, Несвижский с/с, 11.
**Начальная цена** с НДС 20 % – 3 777 759,14 руб.
Задаток – 200 000,00 руб.
Земельные участки: 1. 624250100001000118, 5,2100 га;
2. 624250100001000119, 0,3600 га.
Право постоянного пользования. **Шаг аукциона** – 5 %.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, определения лица, выигравшего аукцион, а также условия аукциона содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на электронной торговой площадке «GOSTORG» (gostorg.by). Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений и задатков **20.01.2025 в 11.00**.

**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• gostorg.by • e-mail: torgi@ino.by**
УНП 190055182

# НА ХВАЛІ АГУЛЬНАГА

## Ярка, шырока, змястоўна пракрочыў

**Гэтыя два дні, 20—21 снежня, умясцілі ў сябе вялікае мноства мерапрыемстваў, акцый, сустрэч. І ўсе іх наведвальнікі нязменна адзначалі прыемныя ўражанні, а таксама пазітыў удзельнікаў, які перадаваўся і назапашваўся.**

### МЕСЦА, КУДЫ ІМКНЕЦЦА ДУША

Варта сказаць, што кожны пункт марафону адрозніваецца сваёй «Знакавай сустрэчай». У Брэсце сустрэча атрымалася не толькі знакавай, але і надзвычай душэўнай, эмацыянальнай. Да брастаўчан адразу прыйшло столькі знакамітасцяў: **алімпійская чэмпіёнка Юлія НЕСЦЯРЭНКА, народны артыст Беларусі Уладзімір ГРОМАЎ, кіраўнік Прэзідэнцкага аркестра Рэспублікі Беларусь Віталь КУЛЬБАКОЎ, генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі краіны Вадзім ГІГІН.** Мадэратарам выступаў радыёвядучы Вадзім Шэпет. Зала чакання брэсцкага вакзала была паўнюткая, яно і зразумела — гараджане ішлі ўбачыць і паслухаць вядомых людзей.

Надзвычай трапна гэтае мерапрыемства арганізатары назвалі «Каб любіць Беларусь нашу мілую». Пра любоў да Беларусі гаварылі ўсе. У тым ліку калі ўдзельнікам прапаноўвалася адказаць на пытанне, ці не ўзнікала ў іх думка калі-небудзь пашукаць сваё шчасце за межамі роднай краіны. Напрыклад, оперны спявак Уладзімір Громаў, вядома ж, быў бы запатрабаваны ў многіх тэатрах свету. Народны артыст адказаў так: «Некалі, у юныя гады ўзнікалі падобныя жаданні. Думаю, гэта ўласціва ўсім маладым людзям — прайсці пэўны перыяд нігілізму, калі цябе ўсё не задавальняе. Але ж паступова пачынаеш станавіцца дарослым, з гадамі набываеш нейкую сацыяльную адказнасць, асабліва калі паяўляецца сям'я. Глядзіш, а ты ўжо маеш і любімую справу, і любімую краіну, і ўжо нікуды не хочаш з'язджаць... Іншая справа — выступаць на замежных сцэнах. Выступленне з іншымі калектывамі, іншымі салістамі, дырыжорамі, рэжысёрамі — гэта дадатковы вопыт, гэта ўзбагачэнне». А яшчэ народны артыст расказаў, што ўсе залы адрозніваюцца: іх розная акустыка па-рознаму ўспрымае галасы вакалістаў.

Напрыклад, зала Вялікага тэатра Беларусі ў гэтым сэнсе асаблівая, яна падкрэслівае любы агрэх, а вось калі артыст спявае правільна, то зала яму адказвае сваёй любоўю.

У артыста, вядома, спыталі, якой яму бачыцца вось гэтая зала чакання больш чым стогадовага вакзала. І Уладзімір Громаў даў станоўчую ацэнку будаўнікам XIX стагоддзя, акустыка, на яго думку, тут вельмі прыстойная. Пазней у гэтым змаглі ўпэўніцца ўсе ўдзельнікі сустрэчы, бо ў канцы іх чакаў сюрпрыз. Уладзімір Громаў заспяваў урывак аднаго са сваіх твораў. Пры гэтым пачынаў ён з мікрафонам, а потым мікрафон прыбраў, і яго мілагучны барытон загучаў-запоўніў сабой прастору вакзала. Зала чакання адказала шчырымі апладысментамі... На што Вадзім Гігін дасціпна заўважыў, што можна ўжо і шыльду вешаць аб тым, што ў будынку вакзала спяваў народны артыст.

...Юлія Несцярэнка на пастаўленае пытанне аб думках пра іншыя краіны адказала вядомым слоганам: «Лучше Бреста нету места» і працягнула думку, што для яе «Радзіма — гэта перш за ўсё беларусы, людзі нашай краіны. Кожны, хто будзе, абараняе, развівае, для









Жывы дыялог

# АБ ВАЖНЫМ

**На Гомельшчыне абласная патрыятычная акцыя «Я за цябе сэрцам, Беларусь» ужо ахапіла Рагачоў, Лоеў, Жыткавічы, Карму, Хойнікі і Калінкавічы. Сапраўды, сардэчная ініцыятыва — ад сэрца да сэрца... Так ацанілі акцыю ў чарговым горадзе яе маршрута — Ветцы. Свята аб'яднала людзей розных пакаленняў і прафесій: прадстаўнікоў грамадзянскай супольнасці, працоўных калектываў прадпрыемстваў, арганізацый, устаноў.**

Мерапрыемства сустракалі ў Веткаўскім цэнтры культуры і народнай творчасці. Акцыя — магчымасць расказаць пра дасягненні раёна, прадставіць яго патэнцыял. Выстаўкі-прэзентацыі падрыхтавалі супрацоўнікі Цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Веткаўскага раёна, Веткаўскай дзіцячай школы мастацтваў. Інтэрактыўныя пляцоўкі прадставілі і раённыя арганізацыі грамадскіх аб'яднанняў БРСМ, Таварыства выратавання на водах, Беларускага Чырвонага Крыжа.

Цэнтральнай падзеяй стаў адкрыты дыялог, на якім выступілі старшыня Веткаўскага раённага выканаўчага камітэта Раман Сяргун, члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Людміла Сапега і Ала Смаляк, старшыня Веткаўскага раённага Савета ветэранаў Аляксандр Скурлоў. Абмяркоўвалі тэмы гісторыі, культуры, эканамічнага развіцця Беларусі і ролі моладзі ў будучым краіны.

— Узгадаю словы нашага Прэзідэнта аб тым, што няма заўтра шчаслівага, калі яно не будзе мірным. Мір і згода павінны быць у кожнага ў сэрцы. Мы будуем сваё жыццё, выразна ўсведамляючы, што толькі ад нас залежыць, якім будзе заўтра, і выразна разумеем: наша сіла — у адзінстве, згуртаванасці, шчырай, самаахвярнай любові да Айчыны. Мы за цябе сэрцам,

# ПАЗІТЫВА




## «Марафон адзінства» ў Брэсце

мяне гэта Радзіма. А яшчэ гэта месца, куды імкнецца душа, дзе камфортна, спакойна, цёпла. Наша Радзіма — гэта магчымасць бясплатна вучыцца, лячыцца, а таксама займацца любімай справай. Менавіта Радзіме я абавязана падтрымкай у ажыццяўленні маёй мары дайсці да алімпійскага п'едэстала, а цяпер яна падтрымлівае мяне ў імкненні быць карысным, маю на ўвазе сацыяльна-дабрачынную дзейнасць, якой займаюся. Для мяне гэта вельмі важна».




### АДЗІНСТВА — ВА ЎМЕННІ ЦАНІЦЬ І ГАНАРЫЦЦА

Мастацкі кіраўнік заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь Прэзідэнцкага аркестра Віталь Кульбакоў расказаў, што ён пачынае сумаваць па родных мясцінах звычайна на шосты-сёмы дзень кожнай паездкі. Нават калі выязджае на адпачынак, праз тыдзень ужо пачынае хацець дадому. Віталь Кульбакоў вельмі цікава расказваў пра сваіх педагогаў, якія вучылі яго не толькі музыцы, але і жыццёваму ўкладу, жыццёвым прынцыпам — словам, многаму навучылі.

Игра проводится в целях стимулирования проведения безналичных платежей (далее – безналичные операции), которые реализуются физическими лицами с использованием банковских платежных карточек Visa (далее – Карточка), эмитированных ОАО «АСБ Беларусбанк» (далее – Банк).

**8. Участники рекламной Игры:**

8.1. В Игре могут принять участие физические лица, держатели Карточек Банка, достигшие 18 лет, – граждане Республики Беларусь, а также иностранные граждане и лица без гражданства, имеющие вид на жительство в Республике Беларусь и постоянно проживающие на территории Республики Беларусь.

8.2. Участником Рекламной игры не может быть лицо, состоящее в трудовых отношениях с организатором Рекламной игры, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, лица, находящиеся с ним в отношениях свойства, а также члены комиссии по проведению Рекламной игры.

Участниками Игры не могут быть члены Правления ОАО «АСБ Беларусбанк», исполнительные директора ОАО «АСБ Беларусбанк», замещающие их лица, а также руководители (заместители руководителей) самостоятельных структурных подразделений Головного офиса ОАО «АСБ Беларусбанк».

**9. Порядок участия в Рекламной Игре.**

Для участия в Рекламной игре необходимо в период **с 00:00:00 25.12.2024 по 23:59:59 28.02.2025** включительно:

9.1. Пройти регистрацию личного кабинета на сайте Игры asb-game.by (далее – Сайт). Зарегистрировать личный кабинет может только владелец банковского счета, к которому выпущена карточка Visa, эмитированная ОАО «АСБ Беларусбанк». Для прохождения регистрации Участник должен на сайте указать следующие данные:

- номер мобильного телефона Участника в международном формате (+375 XX XXX XX XX), указанный в договоре к оформленной карточке Visa в ОАО «АСБ Беларусбанк»,
- фамилию, собственное имя и отчество (если таковое имеется) Участника на русском языке (согласно документу, удостоверяющему личность).

9.1.1. Дать согласие на участие в Рекламной игре, подтвердить ознакомление с настоящими Правилами.

9.1.2. Дать согласие на обработку персональных данных в рамках проведения Рекламной игры.

После заполнения указанных полей Участник получает посредством SMS-сообщения код для входа в личный кабинет на Сайте. Код для входа в личный кабинет, сообщаемый посредством SMS-сообщения необходимо сохранить до окончания Игры.

Участник может зарегистрировать только один личный кабинет. В случае попытки регистрации одним Участником более одного личного кабинета повторные данные не будут приниматься к участию в Игре.

Не позднее 7-ми рабочих дней после создания личного кабинета Участнику автоматически будет направлено уведомление в личный кабинет на Сайте о прохождении либо о непрохождении регистрации.

В случае если информация об Участнике не соответствует данным Банка и Участник получил уведомление о непрохождении регистрации в личном кабинете на Сайте, Участнику необходимо обратиться в любое учреждение Банка для обновления данных и последующей возможности регистрации в Рекламной игре. Срок обновления данных Банком – до 5 рабочих дней, следующих за днем обращения.

9.2. Совершить одну или несколько безналичных операций по оплате товаров/работ/услуг в организациях торговли (сервиса) с использованием принадлежащей Участнику Карточки Банка, эмитированной в любой валюте счета, за исключением операций, перечисленных в п. 9.9 настоящих Правил. При совершении безналичных операций в иностранной валюте сумма безналичной операции конвертируется в белорусские рубли по последнему обменному курсу покупки, установленному ОАО «Беларусбанк» для проведения операций при использовании банковских платежных карточек на дату совершения операции.

9.3. После получения уведомления об успешной регистрации и совершения безналичных операций в личном кабинете Участник Игры получает информацию о накопленных баллах. Баллы для участия в Игре начисляются следующим образом: 1 белорусский рубль = 1 (один) балл. Таким образом, за безналичную операцию в 20,00 BYN (двадцать белорусских рублей 00 копеек) Участник получит 20 (двадцать) баллов, а за безналичную операцию в 22,50 BYN (двадцать два белорусских рубля 50 копеек) Участник получит 22,5 балла и далее по аналогии. Баллы отображаются в личном кабинете на 8 (восьмой) календарный день с момента совершения безналичной операции.

Начисление баллов Участникам Игры, успешно прошедшим процедуру регистрации, производится с момента начала Игры. В случае осуществления Участником Игры возвратов товаров (работ, услуг) баллы, начисленные по данным операциям, либо количество Игровых кодов, эквивалентное сумме возвращенных баллов, аннулируются.

9.5. Статус накопления баллов доступен к отслеживанию в личном кабинете на сайте.

9.6 Для участия в розыгрыше призов необходимо за совершенные в период с 25.12.2024 по 28.02.2025 безналичные операции, указанные в п. 9.2 настоящих Правил, накопить определенное количество баллов согласно Таблице 1 настоящих Правил.

*Таблица № 1*

| № | Наименование Приза | Количество баллов, необходимых для получения 1 (одного) Игрового кода для участия в розыгрыше |
|---|---|---|
| | Приз 1 | 150 |
| | Приз 2 | 250 |
| | Приз 3 | 350 |
| | Приз 4 | 450 |
| | Приз 5 | 700 |
| | Приз 6 | 800 |
| | Приз 7 | 1500 |

9.7. Накопленное количество баллов автоматически конвертируется в Игровые коды для участия в розыгрышах призов. Игровые коды имеют одинаковую разрядность (000001, 000002, 000003 и т. д.) и начисляются Участникам по дате и времени регистрации на сайте, а при совпадении даты и времени регистрации – в алфавитном порядке по фамилии, собственному имени и отчеству (если таковое имеется). В случае получения Участником нескольких Игровых кодов для розыгрыша одного приза ему присваиваются Игровые коды, идущие по порядку. Игровые коды отображаются в личном кабинете Участника не менее чем за сутки до даты проведения соответствующего розыгрыша.

*Пример*

*Участник игры накопил 825 баллов. Он получает 1 Игровой код для участия в розыгрыше приза 6, 1 Игровой код для участия в розыгрыше приза 5, 1 Игровой код для участия в розыгрыше приза 4, 2 Игровых кода для участия в розыгрыше приза 3, 3 Игровых кода для участия в розыгрыше приза 2, 5 Игровых кодов для участия в розыгрыше приза 1.*

9.8. Организатор оставляет за собой право проверки данных о достоверности совершенных безналичных операций Участниками и победителями Игры.

9.9. Не являются основанием для участия в Игре безналичные (и иные) операции:

- операции по снятию наличных денежных средств или пополнению карт-счета;
- по переводу денежных средств с одной банковской платежной карточки на другую банковскую платежную карточку, а также операции в рамках сервиса переводов «Хуткі»;
- по оплате коммунальных услуг;
- по оплате налогов, штрафов (в том числе операции безусловного списания АИС ИДО и операции автоматического погашения просроченной задолженности), судебных издержек, алиментов, обязательных государственных пошлин и государственных услуг;
- безналичные операции, совершенные посредством банкоматов, инфокиосков, М-банкинга, Интернет-банкинга, в системе ЕРИП, в кассах отделений банка;
- безналичные операции по оплате почтовых услуг (в том числе РУП «Белпочта»);
- безналичные операции, связанные с оплатой телекоммуникационных услуг и приобретением телекоммуникационного оборудования, любые платежи в пользу мобильных операторов (Унитарное предприятие по оказанию услуг «А1», СООО «Мобильные ТелеСистемы», ЗАО «Бест») и салонов связи, включая продажу телефонов в салонах связи;
- безналичные операции, связанные с азартными играми (включая операции в казино и иных игорных заведениях, оплата ставок и пари, в том числе через интернет);
- безналичные операции, связанные с прямым маркетингом (в том числе продажей по каталогам, почте, телефону, подписке);
- безналичные операции, связанные с оплатой страховых, финансовых, брокерских, банковских услуг (в том числе по размещению (пополнению) депозитов, по оплате кредитных обязательств и банковских комиссий), а также операции по оплате услуг посредством интернет-ресурса e-pay.by, paypal, liqpay, yandex.money; а также посредством сервиса ООО «ВЭБ ПЭЙ»;
- безналичные операции по оплате услуг по осуществлению пассажирских перевозок (включая железнодорожные перевозки, автобусные линии, авиалинии), в том числе любые платежи в пользу ГО «Белорусская железная дорога»;
- безналичные операции, по которым в течение периода участия в Игре (п. 3 настоящих Правил) совершены возвраты.

9.10. Участником Игры не может быть лицо, совершившее действия, приведшие к необоснованному начислению баллов или получению игровых кодов для розыгрышей призов в Игре. В случае выявления Организатором случаев злоупотребления Правилами Рекламной игры с целью умышленного увеличения количества накопленных баллов, Организатор вправе аннулировать все накопленные Участником баллы, аннулировать решение о признании такого Участника Победителем Рекламной игры.

**10. Состав и размер призового фонда (в белорусских рублях) и источники его формирования:**

Призовой фонд сформирован за счёт имущества и денежных средств Организатора. Размер призового фонда составляет **318 672,28** бел. руб. (триста восемнадцать тысяч шестьсот семьдесят два белорусских рубля 28 копеек) Призовой фонд Рекламной игры включает призы, указанные в Таблице № 2.

**11. Место, дата, время и порядок проведения розыгрыша призового фонда, в том числе порядок определения победителей:**

Розыгрыши призового фонда проводятся согласно графику, указанному в Таблице № 3 Настоящих Правил. Место проведения розыгрыша призов – г. Минск, ул. Ольшевского, д. 22, офис 902.

*Таблица № 3.*

| Номер розыгрыша | Дата и время розыгрыша | Период совершения безналичных оплат | Призы для розыгрыша и их количество |
|---|---|---|---|
| 1 | 12.02.2025 12:00 | 25.12.2024-26.01.2025 | Приз 1, 5 штук,<br>Приз 2, 5 штук<br>Приз 3, 5 штук<br>Приз 4, 5 штук<br>Приз 5, 5 штук<br>Приз 6, 3 штуки |
| 2 | 17.03.2025 12:00 | 27.01.2025-28.02.2025 | Приз 1, 5 штук,<br>Приз 2, 5 штук<br>Приз 3, 5 штук<br>Приз 4, 5 штук<br>Приз 5, 5 штук<br>Приз 6, 3 штуки |
| 3 | 17.03.2025 13:00 | 25.12.2024-28.02.2025 | Приз 7, 1 штука |

11.1. Организатором формируются списки Игровых кодов для розыгрыша каждого приза с указанием ФИО Участников, номера телефона, даты и времени регистрации личного кабинета

11.2. Призы разыгрываются в очередности, описанной в Таблице 3 настоящих Правил.

11.3. Для проведения розыгрышей используется лототрон и набор шаров в количестве 10-ти штук с номерами от 0 по 9. Определение первого выигрышного Игрового кода происходит путем его формирования поразрядно слева направо из номеров шаров, последовательно извлекаемых из лототрона.

Первый разряд Игрового кода определяется следующим путем: в лототрон загружаются шары с номерами от 0 по цифру, соответствующую первому разряду последнего Игрового кода в списке. Шары перемешиваются, и из лототрона извлекается шар, номер которого определяет цифру первого разряда выигрышного Игрового кода. Номер шара вносится в протокол.

Далее в лототрон загружаются те номера шаров, которые существуют по сверенным спискам Игровых кодов в соответствующем разряде. Шары перемешиваются, и из лототрона извлекается шар, номер которого определяет цифру соответствующего разряда выигрышного Игрового кода. Номер шара вносится в протокол.

Для определения последующих разрядов выполняются те же действия. Номера шаров вносятся в протокол. Описанный процесс повторяется до тех пор, пока не будут разыграны все призы.

11.4. В ходе каждого розыгрыша Участник может стать победителем только один раз. В случае если Игровой код Участника совпадает с одним из зафиксированных ранее выигрышных Игровых кодов, выигрышным считается следующий после него Игровой код иного Участника. В случае если Игровой код попадает на конец Списка, то выигрышным будет считаться первый Игровой код иного Участника с начала Списка.

11.6. Дополнительно в ходе каждого розыгрыша определяются резервные победители – по одному для каждого из призов. Резервными Победителями становятся обладатели Игровых кодов, следующих за выигрышными. Если следующий за выигрышным Игровой код принадлежит Победителю Призов 1–7, то выигрышным становится следующий после него первый Игровой код иного Участника. В случае если Игровой код попадает на конец Списка, то выигрышным будет считаться первый Игровой код иного Участника с начала Списка.

11.7. Результаты Розыгрышей в обязательном порядке фиксируются в протоколе Розыгрышей, подписываемые присутствующими на Заседании членами комиссии по проведению Рекламной игры.

**12. Порядок уведомления Победителей о результатах Розыгрыша, порядок получения выигрыша.**

12.1. Организатор уведомляет Победителей о выигрыше звонком и/или SMS-сообщением по номеру телефона, указанном при регистрации в Рекламной игре в течение 5 рабочих дней с даты проведения соответствующего розыгрыша. Организатор оставляет за собой право дополнительно уведомлять Победителей любым удобным ему способом.

12.2. Для получения Призов 1–7 Победители в течение 15 календарных дней с даты проведения соответствующего розыгрыша должны предоставить информацию, сведения Организатору любым из указанных способов:

1) письмом по почте по адресу: ООО «Яскрава», Республика Беларусь, 220073, г. Минск, ул. Ольшевского, д. 22, офис 902;

2) письмом на электронный почтовый ящик Организатора: info@asb-game.by;

3) лично по адресу Организатора: ООО «Яскрава», Республика Беларусь, г. Минск, ул. Ольшевского, д. 22, офис 902,

а именно:

фамилию, собственное имя, отчество (если таковое имеется),

данные о регистрации по месту жительства и (или) месту пребывания,

номер документа, удостоверяющего личность, орган и дату его выдачи,

*Таблица № 2. Призовой фонд Рекламной игры*

| № | Наименование | | Количество шт. | Стоимость за шт., белорусских рублей | Всего стоимость, белорусских рублей |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | **Умная колонка Яндекс Станция Миди с Zigbee YNDX-00054GRY (серый)** | Приз 1 | 10 | 585,00 | 5850,00 |
| | Денежные средства | | | 53,05 | 530,50 |
| 2 | **Умные часы Apple Watch Series 9 GPS 41mm (Starlight, плетеный ремешок)** | Приз 2 | 10 | 1549,98 | 15499,80 |
| | Денежные средства | | | 197,24 | 1972,40 |
| 3 | **Планшет Apple iPad Air 11 2024 128GB Wi-Fi A2902 / MUWC3 (серый космос)** | Приз 3 | 10 | 2799,96 | 27999,60 |
| | Денежные средства | | | 384,02 | 3840,20 |
| 4 | **Телевизор Samsung QE55Q70CAUXRU** | Приз 4 | 10 | 3499,98 | 34999,80 |
| | Денежные средства | | | 488,62 | 4886,20 |
| 5 | **Смартфон Apple iPhone 16 Pro 128GB (черный титан)** | Приз 5 | 10 | 4650,00 | 46500,00 |
| | Денежные средства | | | 660,46 | 6604,60 |
| 6 | **Ноутбук Apple MacBook Air 13» M3 2024 256GB / MRXQ3 (серебристый)** | Приз 6 | 6 | 4699,98 | 28199,88 |
| | Денежные средства | | | 667,93 | 4007,58 |
| 7 | **Легковой автомобиль Geely E8, Седан, Flagship, МКПП2, 4x4. Интерьер: черно-оранжевый; L6T79NEE5RV500727, серебристый, Китайская Народная Республика** | Приз 7 | 1 | 119900,00 | 119900,00 |
| | Денежные средства | | | 17881,72 | 17881,72 |
| | **Итого** | | | | **318672,28** |

идентификационный номер,
адрес доставки приза в Республике Беларусь (для призов 1–6).

После получения вышеуказанных данных Организатор в течение месяца с даты соответствующего розыгрыша осуществляет за счет собственных средств доставку (почтой, службой доставки) призов (за исключением Главного приза) победителям, по адресу, указанном победителем для доставки приза. Датой выдачи является дата отправки приза.

Призы выдаются Победителям при наличии и предъявлении документа, удостоверяющего личность, и после оформления документов, связанных с выдачей Приза.

12.3. Для получения Приза 7 Победитель должен прибыть по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, 22, офис 902 по 17.04.2025 включительно (с понедельника по пятницу, кроме праздничных дней, объявленных нерабочими, с 10.00 до 17.00 или же в субботу 12.04.2025 с 10.00 до 13.00), предварительно согласовав время прибытия с представителем Организатора по телефону +375291961716. При себе Победителю необходимо иметь паспорт гражданина Республики Беларусь (ID-карту или вид на жительство).

12.4. В случае если Победители Призов 1–7 не выполнят действия, перечисленные в пп. 12.2-12.3 настоящих Правил, в установленные сроки либо с Победителем не удается связаться в течение 15 рабочих дней с даты розыгрыша включительно и уведомить о выигрыше, он утрачивает право на получение приза, право на приз переходит резервному победителю, который определяется согласно п. 11.6 настоящих Правил.

Участник, которому перешло право на получение приза, признается Победителем и уведомляется об этом в течение 3 (трех) рабочих дней со дня принятия решения о переходе права на приз звонком и/или SMS-сообщением по номеру телефона, указанному Участником при регистрации в Рекламной игре.

Участник, ставший Победителем в течение 10 календарных дней с даты признания его резервным Победителем, должен выполнить действия, перечисленные в пп. 12.2–12.3 настоящих Правил. Призы будут вручены Резервным Победителям в течение месяца со дня признания резервного победителя таковым службой доставки (почтой, курьерской службой) (для Призов 1–6) либо в офисе организатора (г. Минск, ул. Ольшевского, 22, офис 902) с 10.00 до 17.00 в рабочие дни с понедельника по пятницу, а также, по согласованию с Организатором, в любую субботу в течение этого периода (с 10.00 до 13.00) (для Приза 7).

В случае если Участник, которому перешло право на получение Приза, не выполнит действия в обозначенный срок, он утрачивает право на получение Приза. Призы остаются в распоряжении Организатора.

12.5. Выдача призов представителям Победителей осуществляется по нотариально удостоверенной доверенности.

12.6. Призы не подлежат замене. Выплата денежного эквивалента Призов не осуществляется. Ответственность Организатора по выдаче Призов ограничена количеством и видом призов, указанных в Правилах.

12.7. При получении приза Победитель (Резервный Победитель) несет все права и обязанности по уплате подоходного налога в бюджет Республики Беларусь.

В соответствии с Налоговым кодексом Республики Беларусь Организатор при вручении призов выступает налоговым агентом и обязан удержать сумму подоходного налога непосредственно из доходов получателя приза. При невозможности удержать исчисленную сумму подоходного налога с дохода Победителя, по причине отсутствия ему денежных выплат и (или) отказа плательщика внести причитающиеся суммы подоходного налога с Победителя, Организатор обязан в месячный срок со дня выявления указанных фактов направить в налоговый орган по месту жительства плательщика сообщение о сумме задолженности по подоходному налогу с Победителя.

12.8. В случае если победитель (основной, резервный), претендующий на получение приза, не обеспечивает соблюдение условий Правил (в т.ч. предусмотренных пп. 12.2-12.4 настоящих Правил), он теряет право на получение Приза, Приз остается в распоряжении Организатора.

12.9. Принимая участие в Игре, Участники подтверждают свое ознакомление и согласие со всеми условиями Правил, а также принимают на себя обязательство выполнять все требования Правил и законодательства, вытекающие из участия в Игре и/или связанные с получением приза.

12.10. Победитель, претендующий на получение Приза, обязуется заполнить и подписать все необходимые для его получения документы, предоставляемые Организатором, выполнить все условия, предусмотренные Правилами, а также формальности, необходимые для получения Приза.

12.11. В случае смерти либо признания недееспособным или ограниченно дееспособным Победителя (в т. ч. Резервного Победителя), причитающийся ему Приз получают его наследники, опекуны или законные представители не позднее 7 (семи) месяцев со дня окончания Игры, предоставив паспортные данные, указанные в п. 12.3 настоящих Правил и документы, подтверждающие право на получение Приза, лично по адресу Организатора.

**13. Информация о Рекламной игре, публикация Правил Рекламной игры.**

13.1. Правила Игры подлежат публикации в газете «Звязда» до начала Игры.

13.2. Результаты проведения Рекламной игры подлежат публикации в газете «Звязда» не позднее 26.04.2025.

13.3. Фамилия, инициалы победителей Рекламной игры с указанием их выигрышей будут размещены на Интернет-сайте https://www.asb-game.by/ в срок не позднее 26.04.2025.

13.4. Информацию об условиях участия и проведения Игры можно получить по телефону «горячей линии» +375173887696 с 10:00 до 18:00 ежедневно, по электронной почте: info@asb-game.by.

**14.Общие положения.**

14.1. Участие в Рекламной игре предполагает ознакомление и полное согласие Участников с настоящими Правилами и принятие на себя обязательства соблюдать все их условия и требования.

14.2. Организатор не несет ответственности за работу сети Интернет при ее использовании Участником (например, за работу компаний, предоставляющих услуги сети Интернет Участнику), операторов сотовой подвижной электросвязи (плохое соединение с оператором и т. д.) и почтовой службы (сроки доставки и т. д.).

14.3. Организатор не несет ответственности за невозможность связаться с Участником в случае недостоверной информации, сведений, предоставленных Участником, или невыхода Участника на связь.

14.4. Организатор Рекламной игры не несет ответственности за возникновение дополнительных платежей, в том числе комиссий, взимаемых банками с физических лиц за открытие расчетных счетов; комиссий, удерживаемых банками за снятие денежных средств с физических лиц, и др.

14.5. Споры между Организатором и Участниками Рекламной игры рассматриваются в судебном порядке согласно законодательству Республики Беларусь.

14.6. Все возможные претензии Участников Рекламной игры в отношении организации Рекламной игры должны быть адресованы Организатору Игры по адресу: Республика Беларусь, 220073, г. Минск, ул. Ольшевского, д. 22, оф. 902.

14.7. Участник вправе прекратить участие в Рекламной игре после регистрации в ней, оформив письменное обращение, с указанием своих ФИО, адреса проживания, номера телефона, на имя организатора Рекламной игры, направив его на адрес, указанный в п. 1 настоящих Правил.

*Свидетельство о государственной регистрации № 4501 выдано 18.12.2024 г. Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.*

# ЗЛАВІЦЬ СОНЦА Ў РАСКОЛІНАХ ДРЭВА

## Гутарка з народным мастаком Беларусі Іванам МІСКО

**У майстэрні народнага мастака Беларусі Івана Якімавіча Міско ўвесь час з'яўляюцца новыя працы і эскізы, якія потым паступова пакідаюць майстэрню, каб увасобіцца ў помніку. Так здарылася і з праектам, прысвечаным палёту першага касманаўта Юрыя Гагарына.**



### СКУЛЬПТУРЫ БУДУЦЬ З'ЯЎЛЯЦЦА

— Помнік устанавілі пад Мінскам, у Ліпках, дзе аэраклуб і навучальны цэнтр ДАСААФ, да 90-годдзя гэтага таварыства. У гэты ж дзень там адбылося і адкрыццё Музея космасу, — распавядае Іван Якімавіч. — Мяне вельмі цешыць, што, нягледзячы ні на якія абставіны, у Беларусі з'яўляюцца новыя скульптуры і помнікі, праводзяцца творчыя конкурсы — усё дзякуючы падтрымцы дзяржавы і Прэзідэнта. Вось цяпер разглядаецца прапанова аб'явіць конкурс на помнік удовам Вялікай Айчыннай вайны. Ініцыятыва мая, ліст са зваротам падпісалі народны артыст Беларусі Генадзь Аўсяннікаў, касманаўты Уладзімір Кавалёнак, Марына Васілеўская, Алег Навіцкі. Помнік гэты вельмі патрэбны — у наступным годзе мы адзначаем юбілей Вялікай Перамогі, а тое, што наша пакаленне дзяцей вайны выжыла, — заслуга нашых маці, якія на сваіх плячах вынеслі цяжар ваеннага ліхалецця, фактычна лёс краіны.

***— А як называецца помнік у Ліпках?***

— «108 касмічных хвілін» — час, які Юрый Гагарын быў у космасе. Адна палова з белага граніту, другая — з чорнага, значыць, дзень і ноч. Планую, што такія ж мемарыяльныя знакі з'явяцца на радзіме Гагарына і ў цэнтры падрыхтоўкі касманаўтаў, цяпер шукаем спонсараў. Я задаволены, што ў год 90-годдзя Юрыя Аляксеевіча Гагарына гэты помнік устанавілі. На адкрыцці былі і Уладзімір Кавалёнак, і Марына Васілеўская, і Алег Навіцкі. Айцец Фёдар Поўны назваў мой помнік філасофскім, праўда, я хацеў пачуць ад яго крытычныя заўвагі — але не пачуў.

***— Няўжо любіце крытыку ў свой бок?***

— Мяне заўсёды цікавяць прафесійныя заўвагі, нават калі яны крыўдныя. Праўда, абмяркоўваць трэба не тады, калі праца ўжо адлітая з бронзы. Памятаю, аднойчы, яшчэ ў савецкі час, паехаў я ў Маскву — ліцейныя майстэрні тады меліся толькі ў Піцеры і ў Маскве. Там адлівалася праца «Сустрэча Леніна на Фінляндскім вакзале» Аляксея Глебава. Прыехаў я прымаць гатовую працу, адлітую ў алюмініі. І бачу ў кампазіцыі салдата, рука якога прыварaная ў адваротны бок. Гэта ж у якім стане трэба быць, каб прыварыць руку ў адваротны бок? Работнікі здзівіліся: «Быць таго не можа...» І пры мне яны руку адрэзалі і прыварылі правільна.

### «ЯНЫ ГІПС УМЕЮЦЬ РАЗВОДЗІЦЬ?»

***— А ці заўсёды мастакі прыслухоўваліся да крытыкі калег?***

— Не заўсёды. Памятаю, у камбінаце на Някрасава адбывалася дзяржаўная прыёмка фрагмента мемарыяльнай кампазіцыі Азгура для плошчы Якуба Коласа. Прагучала мноства заўваг. Савет прайшоў, Азгур сказаў: «Фармаваць». Нічога не выправіў, нават не дакрануўся. Што ты скажаш такому мэтру? Бембель, калі да яго прыходзіла мастацкая рада, пытаўся пра маладых яе сяброў: «Гэта хто такія? А што яны закончылі? Нашу акадэмію? Дык нешта я іх не памятаю. Яны гіпс умеюць разводзіць?» Праўда, і крытыка бывае розная. Прыходзіць мастацкая рада ў майстэрню: «Малайчына, як здарава!» Выходзяць: «Як яму не сорамна такое ляпіць!»

***— Значыць, не кожнаму і прафесіяналу варта верыць?***

— Той, хто крытыкуе, павінен быць на тым жа ўзроўні майстэрства, што і той, каго ён крытыкуе. Валянцін Волкаў, стары мастак, які ў нас на першым курсе інстытута вёў малюнак, сядзеў у аўдыторы за намі, таксама маляваў натуршчыка, і як — праз бінокль, які трымаў у руцэ... І ён не баяўся ў канцы ўрока ўзяць гэты аркуш 60х80 са сваім малюнкам, насіць па аўдыторыі і паказваць, як трэба маляваць. Вось якія павінны быць педагогі... Усё-ткі варта ўвесці, каб на нейкім курсе вучань Акадэміі мастацтва мог выбіраць сабе педагога.

### НАТАТНІК БРЫЛЯ І ТЫПАЖЫ

***— І вось вы глядзіце на чалавека і можаце ўсё распавесці па форме яго твару?***

— Часам нават па форме пяткі. Прасвечваю як рэнтгенам: можна ляпіць яго аголеным ці нельга. Ляпіць вельмі прыгожых складана. Там правільныя прапорцыі, а за што зачапіцца? Гэта як у тэатры — трэба тыпаж. Складана гэта — знайсці тыпаж. Аляксей Канстанцінавіч Глебаў выразаў з дрэва партрэт Францыска Скарыны, цяпер усе ўяўляюць Скарыну такім. Мастак, журналіст, пісьменнік заўсёды павінен быць у працы, хапаць, занатоўваць уражанні. Колькі я ездзіў у цягніку з Янкам Брылём — ён сядзіць, размаўляе са спадарожнікамі, пасля раз — дастае маленькі такі нататнічак, нешта запісаў, ізноў у кішэню паклаў. Праходзіць дваццаць хвілін — ізноў дастаў, ізноў запісаў. З Ігарам Лучанком колькі мы ездзілі на рыбалку — яму тая рыба не трэба была. Закасаў штаны, узяў аркуш паперы, залез у нейкія кусты, дзе сонца няма, і нешта ўсё піша, піша... Таму што ў яго галава запоўненая мелодыяй.

***— У вас і партрэт Аладавай стаіць, таксама тыпаж...***

— Так. Калі прыйшоў час рабіць мемарыяльную дошку Аладавай, я сказаў, што адмаўляюся ад аўтарскага ганарару. Яна ўзяла мяне на працу ў мастацкі музей, за што я ўдзячны. І яна прымусіла мяне паступіць у інстытут. Я не хацеў. Пасля вучылішча атрымліваў добрыя замовы, добрыя грошы. І калі Аладава сказала: «Іван Якімавіч, трэба табе вучыцца», я падумаў — навошта? У мяне пайшлі грошы, я мастак, у мяне ёсць дыплом вучэльні... А яна кажа: «Дурны, ідзі вучыся». Пайшла да міністра, дамаглася дазволу, каб я днём хадзіў на вучобу, а вечарам адпрацоўваў у музеі.

### ПАРЗАНЫ ШЫШКІН І ХУТАРСКІЯ ЯБЛЫКІ

***— Кажуць, Аладава валодала незвычайнай здольнасцю здабываць творы для музея?***

— Так. Калі намеціла, што гэтая праца павінна быць у яе музеі, дацісне, даб'ецца. Тады камандуе: «Іван Якімавіч, хутка ў машыну грузі!» Гэта каб не перадумаў прадавец. Помню, прыехалі ў Ленінград, яна дамовілася з адным калекцыянерам. Прыйшлі. Той прынёс работу, разгарнуў, паказаў... «Ну і што гэта такое? Там дзірка, палатно брудное, незразумела, што намалявана... Але рама — выдатная! Колькі ты хочаш за раму?» Калекцыянер назваў цану. Добра, кажа Аладава, куплю раму. Той: «Ну а карціна?» — «А што ты хочаш за карціну?» — «Ну даплаці мне трошкі»... А самае страшнае было, калі некаторыя ўладальнікі самі спрабавалі рэстаўрыраваць карціны. А потым даводзілася выпраўляць за імі. Быў выпадак, калі працу Шышкіна разрэзалі на тры часткі і прадалі ў тры музеі.

***— Вы з дзяцінства назапашвалі ўражанні для будучай творчасці?***

— Так. Памятаю, яблыня расла на нашым хутары... Яблыкі былі такія кіслыя, што іх ірвалі толькі позняй восенню. І маці гэтыя яблыкі клала ў кішэні адзежы, якую складвала на зіму ў куфар, бо шафаў не было. А вясной даставала. Ніводны яблык не згніў. А ўся адзежа была запоўненая водарам саду, водарам яблыкаў — парфумы ж таксама не было. Трыццаць дзявяты год добра памятаю. Бацька сказаў: «Дзеці, ідзіце ў панскі сад, бо паноў тут больш няма, ірвіце яблыкі антонаўкі і насіце на дарогу салдатам». А там чырвоная конніца, і машыны, і танкеткі ішлі са Слоніма на Гродна... І мы рвалі яблыкі і ў кашолках насілі на дарогу. Гэта было такое пачуццё радасці, задавальнення. Салдаты нас печывам частавалі. Многа такіх дэталяў помніцца... Хутарское дзяцінства. Усход сонца... Мне так хацелася паглядзець, адкуль яно ўзыходзіць і чаму хаваецца. Здавалася, яно жывое і са мной гуляе. Вось стары драўляны дом. Трэшчыны на зрубе. Я іх разглядаю, як зморшчыны чалавека.

***— А з дрэвам вы працавалі?***

— Працаваў. Вось цяпер да яго вяртнуўся. Накідаў эскіз, называецца «Усход сонца». Малюнак будуць утвараць трэшчыны. Зараз шукаю, якія пароды дрэва падыходзяць. Хачу звязаць з тэмай іншапланецян. Не магу ад яе адмовіцца.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

Спорт-тайм

# Фігурысты, канькабежцы і шорт-трэкісты вяртаюцца на міжнародную арэну

**У традыцыйным аглядзе «Звязды» расказваем спартыўныя навіны**

**ТУРНІР ТЫДНЯ.** Беларускія спартсмены дастойна выступілі на трэцім этапе Кубка Садружнасці па біятлоне, які прайшоў у Чайкоўскім Пермскага краю Расіі. Ганна Сола стала сярэбраным прызёрам гонкі з масавым стартам. Яна была самай хуткай на лыжні, і нават чатыры промахі на агнявых рубяжах не перашкодзілі ёй падняцца на п'едэстал. У мужчынскай гонцы з масавым стартам Антон Смольскі і Дзмітрый Лазоўскі занялі другое і трэцяе месцы адпаведна. Дзінара Смольская стала сярэбраным прызёрам жаночай гонкі праследавання. Ганна Сола ў гэтай гонцы фінішавала чацвёртай.

**МАТЧ ТЫДНЯ.** Хакеісты клуба «Дынама-Мінск» скончылі выязную серыю ў Ташкенце ў рамках праекта KHL World Games. Сапернікам «зуброў» стаў маскоўскі «Спартак», якому мінчане саступілі з вынікам 3:2. Да гэтага ўпершыню ў бягучым сезоне рэгулярнага чэмпіянату Кантынентальнай хакейнай лігі «Дынама-Мінск» выйграла тры матчы запар. Падчас выязной серыі яны абыгралі «Амур» — 5:2, «Трактар» — 3:1, «АК-Барс» — 3:1. Такім чынам, «Дынама-Мінск» займае сёмае месца ў табліцы Заходняй канферэнцыі КХЛ, у актыве мінскай каманды 43 балы ў 36 гульнях. Далей «зуброў» чакае пераднавагодняя дамашняя серыя з трох матчаў, у якой мінчане згуляюць з «Ак Барсам» (25 снежня), маскоўскім «Дынама» (27.12) і «Лакаматывам» (29.12).

**АБ'ЯВА ТЫДНЯ.** Міжнародны саюз канькабежцаў (ISU) допусціў беларускіх і расійскіх спартсменаў да ўдзелу ў алімпійскай кваліфікацыі ў нейтральным статусе.



Фота з адкрытых крыніц.

Савет ISU прапанаваў пераняць вопыт МАК адносна выступлення беларускіх і расійскіх атлетаў у нейтральным статусе і дапусціць атлетаў абедзвюх краін да ўдзелу ў адборачных стартах на Гульні-2026 у Італіі. Для гэтага прадстаўнікі Беларускага саюза канькабежцаў павінны падаць заяўкі на ўдзел у спаборніцтвах не пазней за 28 лютага 2025 года. Алімпійскія кваліфікацыйныя спаборніцтвы па фігурным катанні пройдуць у верасні наступнага года ў Пекіне. Адбор на Гульні ў шорт-трэку будзе ажыццяўляцца на этапах Сусветнага тура ў Манрэалі, Солт-Лэйк-Сіці, Гданьску і Дордрэхце, якія пройдуць у перыяд з 16 кастрычніка да 30 лістапада 2025 года. Ліцэнзійнымі для канькабежцаў стануць этапы Кубка свету ў Солт-Лэйк-Сіці, Калгары, Херэнвене і Хамары з 14 лістапада да 14 снежня 2025 года.

**ЛІЧБА ТЫДНЯ.** Шэсць медалёў заваявалі беларусы на чэмпіянаце Расіі па канькабежным спорце на асобных дыстанцыях. Марына Зуева стала пераможцай на дыстанцыі 5000 метраў, яе вынік — 7 мін. 05,75 сек. Яшчэ адна наша спартсменка Паліна Сівец заняла чацвёртае месца, уступіўшы трэцяй пазіцыі ўсяго адну дзясятую секунды. Дыстанцыю ў 1000 метраў першай скончыла Ганна Дамарацкая з вынікам 1 мін. 15,35 сек. Ганна Дамарацкая таксама заняла другое месца на 500 метрах (37,84 сек.), за ёй фінішавала яшчэ адна беларуская спартсменка — Кацярына Гагіева (38,42). Гагіева заняла трэцяе месца і на дыстанцыі 1000 метраў. Бронзавы медаль на тысячы заваяваў таксама Ігнат Галавацюк, ён пераадолеў дыстанцыю за 1 мін. 9,48 сек.

**ПОСПЕХ ТЫДНЯ.** У Осла стартаваў фінал прэстыжнага міжнароднага турніру па хуткіх шахматах Champions Chess Tour 2024. Удзел у спаборніцтвах бяруць восем найлепшых шахматыстаў па выніках чатырох анлайн-этапаў Тура чэмпіёнаў 2024 года, у лік наймацнейшых трапіў і беларус Дзяніс Лазавік. Асноўны раўнд фіналу ўяўляе сабой кругавы турнір, у якім шахматысты адзін раз гуляюць адзін супраць аднаго. У першы дзень адбыліся тры туры — Лазавік атрымаў перамогі над Максімам Ваша-Лагравам з Францыі і немцам Вінцэнтам Каймерам, а таксама згуляў унічыю з яшчэ адным французам Алірэза Фіруджа.

Каманда тыдня. Валейбалісты салігорскага «Шахцёра» выйгралі «фінал чатырох» Кубка Беларусі сярод мужчынскіх каманд. У фінальным паядынку салігорскія валейбалісты не прайгралі гомельскай «Энергіі» ніводнага сэта (25:19, 25:21, 25:21). Для салігорскага клуба гэтая перамога ў розыгрышы Кубка Беларусі стала сёмай у гісторыі, «гарнякі» выйгралі ўсе фіналы турніру пачынаючы з 2018 года. Да гэтага ў паядынку за бронзавыя медалі «Барысаў-БДУФК» адолеў «Сталіцу» з лікам 3:1 (26:24, 22:25, 24:21, 26:24).

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# АЛЁ, НАРОД!..

ВЯСЁЛЫЯ І ЦІКАВЫЯ ГІСТОРЫІ АД ЧЫТАЧОЎ «ЗВЯЗДЫ»

Вядучая рубрыкі Валянціна ДОЎНАР.

## МЯЦЕ НЕ ТОЛЬКІ МЯЦЕЛІЦА

...У нас тады вельмі добры быў вечар — ціхі, лагодны — і добрыя госці. Разам з імі мы сядзелі за сталом, разглядалі фотаздымкі, успаміналі сваякоў — і блізкіх, і далёкіх, і жывых, і тых, хто даўно ўжо сышоў.

Гэтая сям'я (бабуля, бацька, маці і сын) жыла на хутары: сядзіба як сядзіба і людзі як людзі. Сынок, праўда, недахоп адзін меў: еў — як валоў мо сем, аж нос прыгінаўся!

Дык вось увабраўся той дзяцюк у гады, пара яму і да шлюбу. Нехта з радні параіў працавітую, дружную сям'ю з дзяўчынай гадоў васямнаццаці: вырашылі паехаць у сваты. Запрэглі коней, цёпла апрануліся. Бацька жаніха прамовіў сваё «З Богам!», матуля цішком папрасіла сынка, каб хоць не вельмі шчыраваў за сталом... Лепш, маўляў, потым, на зваротным шляху пад'есці: яна ссабойку падрыхтавала — паклала яе ў вазок...

Доўга ці коратка сваты тыя ехалі, гісторыя замоўчвае, але ж вось і хата дзяўчыны. Коні спыніліся каля веснiц; ездакі, каб чутно было ў хаце, сталі пра нешта гаманіць. На галасы праз колькі хвілін выйшаў гаспадар, спытаў:

— Што за людзі будзеце? Чаго заблудзілі?

— Былі на паляванні, гналі куніцу, — пачаў хросны бацька жаніха, ён жа сват... Ну і далей усё як пісана: язык у чалавека падвешаны.

Гаспадар на марозе паслухаў крыху — запрасіў у хату. Сваты адразу ж паставілі на стол свае хлеб-соль ды гарэлку, потым бацькі дзяўчыны далучылі сваю, пасядзелі, выпілі-закусілі (жаніх з усіх сіл трымаўся: мала піў, яшчэ меней еў). Людзі пагаварылі і зладзілі такі справу: атрымалі згоду на шлюб.

...Самым першым з хаты на вуліцу выскачыў жаніх. Напэўна, заўважыў, што мяцеліца разгулялася, але ж ён на яе не зважаў: пакіраваў да воза, выцягнуў матуліну ссабойку, узяўся есці.

Услед за жаніхом на падворку з'явілася гаспадыня:

— Во, мяце дык мяце! — паскардзілася яна, маючы на ўвазе завіруху.

Жаніх ад нечаканасці ледзь не падавіўся. Спытаў:

— А вам да гэтага што? Сваё ж ем, не ваша!

...Ваша, то-бок цёшчына, было потым. Недзе праз месяц маладыя згулялі вяселле, зажылі, з часам у сям'і нарадзілася трое дзяцей, але гэта ўжо іншая гісторыя.

**Іван Букоўскі,**

*в. Шуневічы, Глыбоцкі раён.*

**Ад вядучай рубрыкі і, як той казаў, наўздагон трохі сумнае: «Апошнія лісткі ў календары, сыходзіць год — самотны і стары...»**

**А гэта значыць, што ў рэдакцыі ўжо рыхтуецца адмысловая табліца з пералікам усіх «вясёлых і праўдзівых гісторый», надрукаваных у сыходзячым 2024-м — з прозвішчамі аўтараў, з датамі публікацый... Дзе потым, ужо ў новым годзе, з'явяцца птушачкі-балы...**

**Вам хацелася б далучыцца сваёй і тым самым дапамагчы рэдакцыйнаму журы падвесці вынікі — вызначыць пераможцаў конкурсу? Ды калі ласачка!**

**Як летась, як пазалетась, як заўжды, «Звязда» шчыра вітае думкі-меркаванні сваіх чытачоў і, вядома ж, улічвае. Пішыце.**




Малюнак Анатоля ГАРМАЗЫ.

## Надвор'е на заўтра

| Горад | Ціск | Ноччу | Днём |
| --- | --- | --- | --- |
| МІНСК | 776 мм рт.сл. | -2..0°C | -1..+1°C |
| ВІЦЕБСК | 775 мм рт.сл. | -2..0°C | -1..+1°C |
| МАГІЛЁЎ | 776 мм рт.сл. | -2..-1°C | -2..0°C |
| ГОМЕЛЬ | 776 мм рт.сл. | -2..-1°C | -1..0°C |
| ГРОДНА | 777 мм рт.сл. | -2..0°C | -2..-1°C |
| БРЭСТ | 778 мм рт.сл. | 0..+1°C | -1..0°C |

Паводле даных Белгідрамета

**Месяц**

*Апошняя квадра 23 снежня.*

*Месяц у сузор'і Шаляў.*

**Геамагнітныя ўзрушэнні**

22 гадз., 01 гадз., 04 гадз., 07 гадз., 10 гадз., 13 гадз., 16 гадз., 19 гадз.

Абазначэнні:
— няма прыкметных геамагнітных узрушэнняў
— нязначныя геамагнітныя ўзрушэнні
— слабая геамагнітная бура
— малая геамагнітная бура

**...у суседзяў**

МАСКВА 0..+2°C

С.-ПЕЦЯРБУРГ +1..+3°C



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

**24 СНЕЖНЯ** Даты | Падзеі | Людзі

У краіне



**1784** год — нарадзіўся (в. Гайна, цяпер у Лагойскім раёне) Зарыян Якаўлевіч Даленга-Хадакоўскі (Адам Чарноцкі), славяназнавец, адзін з заснавальнікаў беларускай археалогіі, фалькларыстыкі, этнаграфіі і дыялекталогіі. Член Пецярбургскага Вольнага таварыства аматараў расійскага пісьменства, маскоўскага Таварыства гісторыі і старажытнасцяў расійскіх. Працаваў у Мінску прыватным адвакатам, вывучаў старажытныя беларускія акты і граматы. Даследаваў гарадзішчы ў Полацку, Віцебску, Тураве, каля Брэста, Гомеля, Магілёва. Рабіў запісы фальклору, мясцовых дыялектаў, абрадаў. Склаў рэестр агульнаславянскіх тапонімаў, у тым ліку беларускіх, вызначыў тэрыторыі распаўсюджвання беларускай мовы.

**1904** год — нарадзіўся (в. Навасёлкі, цяпер у Петрыкаўскім раёне) Алесь Дудар (Аляксандр Аляксандравіч Дайлідовіч), беларускі паэт, крытык, перакладчык.

**1939** год — нарадзіўся Уладзімір Міхайлавіч Мажуль, беларускі вучоны, член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар біялагічных навук, прафесар. Аўтар больш за 300 навуковых прац. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі.

У свеце

**1801** год — англійскі механік-канструктар Рычард Трэвіцік прадэманстраваў першы паравы аўтамабіль.

**1900** год — у Лейпцыгу выйшаў першы нумар «Искры» — першай агульнарускай газеты РСДРП. Па задумцы Леніна, «Искра» павінна была згуртаваць разрознены рэвалюцыйны рух у Расіі на аснове марксізму. Ленін пачаў арганізоўваць газету пасля ссылкі ў Шушанскім.

**1958** год — Вярхоўны Савет СССР прыняў закон «Аб умацаванні сувязі школы з жыццём і аб далейшым развіцці сістэмы народнай адукацыі ў СССР»: уведзена ўсеагульная васьмігадовая абавязковая адукацыя, пакладзены пачатак стварэнню ў краіне сеткі ПТВ.

**Наступны нумар выйдзе 26 снежня 2024 года.**

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар АНУФРЫЕВА Вольга Аляксандраўна.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 38200000007667 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 10 722. Індэкс 63850. Зак. № 2859.

Нумар падпісаны ў 19.30 23 снежня 2024 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12